Щ 941.1
Р 609

# Родная старонка

РЕПОЗИТОРИЙ ...

Бібліятэка БДУК

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР
РЭСПУБЛІКАНСКІ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР КУЛЬТУРЫ

# РОДНАЯ СТАРОНКА

## РЭПЕРТУАРНЫ ЗБОРНІК ДЛЯ АКАДЭМІЧНЫХ ХАРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

06

БІБЛІЯТЭКА
Мінскага ін-та культуры
Інв. № 39336

МІНСК 1989

## АД УКЛАДАЛЬНІКА

Харавыя спевы з'яўляюцца старэйшым і любімым жанрам музычнай творчасці нашага народа. Невычэрпнай крыніцай яго развіцця здаўна служыць народная песня. Выпеставаная народнай мудрасцю, яна праз мелодыю і слова ў аўтэнтычным выглядзе ці ў мастацкай апрацоўцы служыць эстэтычнаму выхаванню чалавека, ствapae частку яго духоўнага багацця, несучы ў сабе высакародныя маральна-этычныя ідэалы.

У прапануемы зборнік увайшлі творы рускіх і савецкіх кампазітараў А. Грэчанінава, А. Свешнікава, К. Галкоўскага, а таксама малавядомыя хоры і апрацоўкі сучасных беларускіх аўтараў. Для ўсіх хораў як «а капэла», так і ў суправаджэнні фартэпіяна, характэрны лірычны пачатак, што садзейнічае спяванню мяккаму, без фарсіравання гуку. Харавыя галасы не выходзяць за межы рабочага дыяпазону, адсутнічаюць крайнія высокія і нізкія рэгістры ў гучанні, што таксама спрыяе рашэнню выканаўчых задач.

Харавыя партытуры вызначаюцца яснасцю голасавядзення, нескладанай гармоніяй, простай формай (куплетная, куплетна-варыяцыйная). Музычны матэрыял зборніка падабраны па прынцыпу ад простага да больш складанага.

Зборнік разлічаны ў першую чаргу на самадзейныя акадэмічныя харавыя калектывы, а таксама можа мець практычнае выкарыстанне ў педагагічнай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ

«РОДНАЯ СТАРОНАЧКА» — апрацоўка для 2-галоснага аднароднага хору сучаснай беларускай народнай песні.

Характэрна простае, арганічнае спалучэнне асноўнай мелодыі і падгалоска. Павольны тэмп, спадручны дыяпазон, распеўнасць складоў, умераная дынаміка ствараюць мяккі лірычны вобраз, спрыяюць выкананню песні акруглым гукам, на дыханні.

«АХ ТЫ, САЛАВЕЙ». Харавая 4-галосная мініяцюра, у аснове якой згарманізаваная, двойчы паўтораная страфа з інтанацыямі веснавых папевак.

Роўнае, распеўнае гучанне жаночых галасоў на фоне дамінантавага падгалоска мужчынскай групы і гамафонна-гармацічнае правядзенне паўтору ў соль-мажоры.

Пры развучванні звярнуць увагу на функцыянальныя гарманічныя змяненні і ўраўнаважанасць харавых галасоў.

«ВЕЦЕР ВЕЕ». У аснову 4-галоснай гарманізацыі для мяшанага хору пакладзена імітацыя паміж галасамі, узмацняючая ролю слова.

Мажліва, не ўсе словы тэксту адпавядаюць сённяшняму часу, таму можна выконваць 1-ы куплет, дзве першыя страфы 3-га і дзве апошнія — 4-га куплета (аб'яднаць) і далей на парадку.

«А ДЗЕ СОНЦА ЎЗЫЙДЗЕ...» Песня згарманізавана для 4-галоснага мяшанага хору. Строга гарманічная фактура песні перадае значнасць і глыбіню інтымных пачуццяў.

Аснову першага куплета (дзве страфы) складае арганны пункт нізкіх галасоў (А—Б), на фоне якога плятуць меладычную канву верхнія галасы (С—Т). Другі куплет атрымлівае варыянтнае развіццё адносна першага большай рухомасцю галасоў і разнастайнасцю гарманічных фарбаў.

Пры развучванні звярнуць увагу на чысціню, роўнасць гучання і дыкцыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«А Ў ПОЛІ ВЯРБА». Выкананне гэтай апрацоўкі патрабуе ад удзельнікаў валодання пэўнымі вакальна-харавымі навыкамі. Для яе характэрна пераменная фактура, самастойнасць і гібкасць голасавядзення, передача меладычнага матэрыялу з голасу ў голас, кантрастная дынаміка. Унутрыскладовая распеўнасць садзейнічае развіццю дыхання і гібкасці голасу.

«СТАРЫЯ ДУБЫ». Мяшаны 4-галосны хор, гамафонна-гарманічная фактура. Музычны абразок прынёманскага куточка прыроды, навеяны паэтычным словам Якуба Коласа.

Некаторую рытмічную і гарманічную аднастайнасць фактуры можна кампенсаваць за кошт гукавядзення, нюансіроўкі.

«О, КРАЙ РОДНЫ!». Мяшаны 4-галосны хор мяккага, лірычнага, напеўнага характару, гамафонна-гарманічнай фактуры з выразнай мелодыяй адпавядае паэтычнаму настрою тэксту (урывак з паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка»).

Неабходна дабівацца выразнай дыкцыі, большай разнастайнасці выканання праз тэмбравую афарбоўку галасоў, выканаўчыя штрыхі, агогіку.

«ОЙ, ПАЛЫН МОЙ, ПАЛЫНОЧАК». Апрацоўка народнай песні для мяшанага 3-галоснага хору (С—А—М). Складанасць заключаецца ў захаванні метрарытму і інтанацыйнай дакладнасці.

Выкананне патрабуе яснай дыкцыі і спявання інтэрвалаў у мелодыі без «пад'ездаў». Гарманічныя акордавыя адхіленні ад ладу ў канцы фраз прыдаюць вастрыню гучанню. Некаторыя інтэрвалы (пав. 2, 4) патрэбна завучваць. Такія акорды можна выстройваць як асобна, так і суадносіць з ладам песні. Некаторая адарванасць верхняга голасу ад астатніх вымагае прымянення штучнага ансамбля.

«КАСТРЫЧНІК». Мяшаны 3-галосны хор, напісаны ў кантавай традыцыі. Некаторую складанасць у развучванні выклікае рытмічная будова сярэдзіннага эпізоду (імітацыя, асціната). Акрамя цвёрдага завучвання сваіх партый, важную ролю ў гэтым моманце адыгрывае паказ дырыжора.

«ТРЫ АПРАЦОЎКІ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ» («Туман, туман, матушка», «З-пад белага камушка», «Ой, там, на гарэ»). Выкананы для 3-галоснага жаночага хору, але могуць спявацца і вакальным ансамблем з найбольш падрыхтаваных удзельнікаў хору.

Больш складаныя першыя дзве апрацоўкі з-за іх паліфанічнасці (меладычная, рытмічная самастойнасць галасоў). Складанасць рытмічнага боку цесна звязана з дыкцыяй (устаўныя галосныя). Пры развучванні рэкамендуецца рытмічная пульсацыя, выдзяленне асноўнай тэмы, добрае веданне сваіх партый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«ГО-ГО-ГО, КАЗА!». Апрацоўка каляднай песні на народныя словы для 3-галоснага няпоўнага мяшанага хору (С — А — Т) і бубна, з выкарыстаннем шумавых эфектаў. Гэтая апрацоўка пры жывым тэатральным выкананні разнастаіць выступленне калектыву. Пры адсутнасці тэнаравай партыі апрацоўку можна выконваць жаночым хорам (С — $С^2$ — А). Характэрна прымяненне арганнага пункта, перадача асноўнай тэмы з голасу ў голас. Звярнуць увагу на захаванне адзінага тэмпу.

«ВЯСНА». 4-галосны мяшаны хор, пабудаваны на веснавых абрадавых папеўках. Пры развучванні дабівацца зладжанасці паміж парамі высокіх і нізкіх галасоў. Некаторую складанасць выклікае поліфанічны эпізод у 8—11-ым, а таксама ў заключных тактах. Запеў хору можна даручыць (у адпаведнасці з наяўнасцю галасоў) тэнарам (у арыгінале). Гібкая мелодыка, дынаміка, тэмпавыя змяненні патрабуюць ад хору валодання дыханнем на апоры, пачуцця рытмічнага і дынамічнага ансамбля, увагі да паказу дырыжора.

«ДЫ ПОЙДЗЕМ, СЯСТРЫЦЫ». Апрацоўка купальскай народнай песні для мяшанага 4-галоснага хору і фартэпіяна. Асноўны меладычны матэрыял дадзены для альтовай, часткова сапранавай, партыі. Мужчынскія галасы адпаведна выконваюць ролю гарманічнага аздаблення — арганны пункт, падгалоскі. Найбольшую складанасць для харыстаў і дырыжора выклікаюць уступы галасоў на дробныя долі тактаў. Выкананне фаршлагаў падтрымліваецца суправаджэннем. Ад удзельнікаў патрабуецца валоданне вакальна-харавымі навыкамі («цапное» дыханне, гібкая нюансіроўка, дыкцыя, прыём спявання «закрытым» ротам і інш.). Суправаджэнне дапамагае стварэнню вобраза песні, спрыяе строю і ансамблю. Хор можна выконваць з тэкстам, пачынаючы з 7-й страфы.

«КРАЙ МОЙ». Песня для жаночага голасу і 3-галоснага мяшанага хору ў суправаджэнні фартэпіяна. Куплетная форма (запеў, прыпеў), невысокая тэсітура галасоў, сам характар мелодыі робяць гэтую песню прыдатнай і для хору з народнай манерай выканання.

«МОЙ РОДНЫ КУТ». Пераклад вядомага вакальнага твора І. Лучанка для салісткі і 4-галоснага жаночага хору ў суправаджэнні фартэпіяна. У зборніку пададзены тры харавыя варыянты адпаведна куплетам песні: І варыянт — сола і харавы прыпеў; ІІ варыянт — сола на фоне гучання хору з закрытым ротам, прыпеў; ІІІ варыянт — харавы запеў і прыпеў сола, кода.

Адносную складанасць у выкананні выклікае ІІІ варыянт сваёй поліфанічнасцю (імітацыяй). Умовай паспяховага выканання хору служыць добра пастаўленая работа над вакалам і іншымі музычна-харавымі навыкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«СПАДЧЫНА». 3-галосны жаночы хор з «divisi» ў альтовай партыі ў суправаджэнні фартэпіяна напеўнага, лірычнага характару. Дадзены тры варыянты запеву. Патрабуецца гукавая і рытмічная роўнасць выканання, выразнасць дыкцыі, разнастайнасць нюансіроўкі (прыпеў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РОДНАЯ СТАРОНАЧКА

Апрацоўка І. Кузняцова




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

35

## АХ ТЫ, САЛАВЕЙ

(Народная з Пастаўшчыны)

Гарм. К. Галкоўскага




Ах ты, салавей, ранняя птушка /2/,
Ты не шчабячы, на луг лётучы /2/, —
Ты зашчабячы, ў садзе седзючы /2/,
Ты не абівай ранняй расіцы /2/, —
Няхай абаб"ець мая сястрыца /2/,
Ка мне ідучы, адведваючы /2/,
Бо людзі кажуць, што я панную /2/.
Я не паную і не гарую /2/:
Няма дзе выйсці пагаварыці /2/,
Папалам журбу падзяліці /2/.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЕЦЕР ВЕЕ

(Народная з Ашмяншчыны)

Гарм. К. Галкоўскага




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вецер вее, сонца грэе,
Жыта палавее,
Маладая дзяўчыначка
Работкі не ўмее.

Ані шыцi, ані прасцi,
Ані кросны ткаці,
Як зайграюць музыканты,
Першая гуляці.

На вуліцы белы камень
Сонца асвяціла,
Кліча маці вячэраці,
Вячэра не міла.

— Ой, вячэрай, мая маці,
Калі наварыла,—
Няма майго міленькага
З кім я гаварыла.

Ад усходу вецер вее,
Былінку калыша,
А мой мілы штось сярдзіты —
Лісточкаў не піша.

— Пішы, міленькі, лісточкі,
Ды не забывайся,
На чужыя харошыя
Ты не заглядайся.

Бо чужыя харошыя,
Яны сабе пышны,
А мы з табой, мой міленькі,
Як у садзе вішні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## А ДЗЕ СОНЦА ЎЗЫЙДЗЕ, ТАМ РАСЫ НЕ БУДЗЕ

Гарм. А. Грэчанінава

Moderato




А дзе сонца ўзыйдзе,
Там расы не будзе,
З нашага кахання
Нічога не будзе.

Прыляцелі гусі
Ды з чужога краю,
Памуцілі воду
На ціхім Дунаю.

Бадай жа вы, гусі,
Марна запрапалі,
Як мы кахаліся,
Цяпер перасталі.

Каго я любіла,
То ў людзі пусціла,
Каго я не знала,
З тым да шлюбу стала.

Бывайце здаровы,
Сцежкі і дарожкі,
А дзе ж пахаджалі
Мае белы ножкі.

Бывайце здаровы,
Тутэйшыя людзі,
Прашу ўспамінаці,
Як мяне не будзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# А Ў ПОЛІ ВЯРБА

(Народная)

Гарм. А. Свешнікава

СПЕЎНА, РЫТМІЧНА




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А ў полі вярба,
Пад вярбой вада,
Там хадзіла, там гуляла
Дзеўка малада. } 2 разы

Дзеўка ад вады,
Хлопец да вады:
— Пастой, пастой, дзяўчыначка,
Дай каню вады. } 2 разы

— Рада б пастаяць,
Каню вады даць,
Мае босенькія ножкі,—
Сцюдзёна стаяць. } 2 разы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СТАРЫЯ ДУБЫ

Верш Я. КОЛАСА

Музыка П. Карузы




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зноў я бачу, зноў вітаю
Сілачоў вельможных —
Па-над Нёманам у гаі
Гурт дубоў разложных.

Сам не ведаю, чым мілы,
Чым вы сэрцу любы,
Выхаванцы веку, сілы,
Магутныя дубы.

Чымся мілым, чымся родным
Ад вас павявае,
Аж мне сэрца ў спеў лагодны
Штосьці ахінае.

Ўзварухнуцца думкі-песні,
Як вашы лісцінкі,
І зноў станеш напрадвесні
Жыццёвай пуцінкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Зак. 5857



Інв. № 39336

Верш Я. КОЛАСА

# О, КРАЙ РОДНЫ

З паэмы «Сымон-музыка».

Музыка П. КАРУЗЫ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Ніва гутаркі вядуць;
Гэтых гмахаў безгранічных
Балатоў тваіх, азёр,
Дзе пад гоман хваль крынічных
Думкі думае прастор;
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе вясной лугі цвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуць.

Гэй, адвечныя курганы,
Сведкі прошласці глухой!
Кім вы тут панасыпаны?
Чыёй воляю-рукой
Вы раскіданы па полі,
Даўных спраў вартаўнікі?
Эх, не скажаце ніколі,
Што казалі вам вякі!
Вы пуцінаю няроўнай
Бежыце ўдалечыню,
У бок Віліі чароўнай
І пад светлую Дзвіну.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ОЙ, ПАЛЫН МОЙ, ПАЛЫНОЧАК

Апрацоўка С. Бельцюкова




РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ

# КАСТРЫЧНІК

Верш А. Салтука

Музыка А. Рашчынскага




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 1. ТУМАН, ТУМАН, МАТУШКА

Словы народныя

Апрацоўка А. РАШЧЫНСКАГА




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. З-ПАД БЕЛАГА КАМУШКА

Апрацоўка А. Рашчынскага




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ОЙ, ТАМ, НА ГАРЭ

Апрацоўка А. Рашчынскага




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГО-ГО-ГО, КАЗА

Словы народныя

Апрацоўка Л. Сімаковіч




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* На першую долю апошняга такта тупнуць нагой.

## ВЯСНА

Верш Я. Коласа

Музыка М. Літвіна




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Пажадана запеў альтовай партыі даручыць тэнарам /з напісаннем у І-й і 2-й актаве/




РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ







РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ДЫ ПОЙДЗЕМ, СЯСТРЫЦЫ

Беларуская народная песня
для мяшанага хору і ф-на

Апрацоўка С. Янковіча




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗІТОРЫЙ БГУКІ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Ды пойдзем, сястрыцы, пад ясну зарніцу,
Ночка мала купальная /паўтараецца пасля кожнага радка/.
Набяром, сястрыцы, жоўтага пясочку,
Пасеем, сястрыцы, ў таткі на дварочку.
Пазнаці, пазнаці — пясочак не ўзойдзіць,
Пясочак не ўзойдзіць — мне ў таткі не быці,
Мне ў таткі не быці, вяночкі не віці.
Ды пойдзем, сястрыцы, пад ясну зарніцу,
Набяром, сястрыцы, яравой пшаніцы,
Пасеем, сястрыцы, ў свёкра на дварочку.
Пазнаці, пазнаці — пшаніца узойдзіць,
Пшаніца узойдзіць — мне ў свёкаркі быці,
Мне ў свёкаркі быці, дварочкі красіці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КРАЙ МОЙ

Песня для голасу і мяшанага 3-галоснага хору
ў суправаджэнні фартэпіяна.

Верш С. ПАНІЗНІКА

Музыка В. ВОЙЦІКА




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




На Беларусі
сіняюць азёры,
Над Беларуссю —
сінія зоры.
Вечар агністы,
ў паднеба світанне,
Тут з маёй доляй вячыстай
спатканне.

Прыпеў: Край мой — маё сумленне,
Радасць мая і гордасць.
Край мой — маё маленне
Перад бядою і горасцю.

Над Беларуссю —
срэбраны ветах,
І Беларусь мая —
папараць-кветка.

Гэта сыны ёй
наканавалі,
Тыя,
што маці сваю шанавалі.

Каб не згасала
імя дарагое,
Наша азёрнае
і баравое,
Каб з нашых песень
шэрыя гусі
Неслі у выраі
грай Беларусі.

Прыпеў: Край мой — маё сумленне,
Радасць мая і гордасць.
Край мой — маё маленне
Перад бядою і горасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МОЙ РОДНЫ КУТ

Верш Я. КОЛАСА

Музыка І. ЛУЧАНКА

Пераклад для жаночага хору М. КОРСАКА




*) Хор па жаданню можна выконваць a capella.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



A...
poco a poco rit.
A...
poco a poco rit.
pp
Мм...
pp
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПАДЧЫНА

Верш Я. КОЛАСА

Музыка І. ЛУЧАНКА

УМЕРАНА, ЗАДУШЭЎНА




РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ


Ад укладальніка . . . 2
Кароткія метадычныя парады . . . 3
Родная староначка. Апрацоўка І. Кузняцова . . . 7
Ах ты, салавей (народная з Пастаўшчыны). Гарм. К. Галкоўскага . . . 8
Вецер вее (народная з Ашмяншчыны). Гарм. К. Галкоўскага . . . 9
А дзе сонца ўзыйдзе, там расы не будзе. Гарм. А. Грэчанінава . . . 11
А ў полі вярба (народная). Гарм. А. Свешнікава . . . 12
Старыя дубы. Верш Я. Коласа, музыка П. Карузы . . . 15
О, край родны (з паэмы «Сымон-музыка»). Верш Я. Коласа, музыка П. Карузы . . . [illegible]
Ой, палын мой, палыночак. Апрацоўка С. Бельцюкова . . . 21
Кастрычнік. Верш А. Салтука, музыка А. Рашчынскага . . . 22
Туман, туман, матушка. Словы народныя, апрацоўка А. Рашчынскага . . . 24
З-пад белага камушка. Апрацоўка А. Рашчынскага . . . 27
Ой, там, на гарэ. Апрацоўка А. Рашчынскага . . . 29
Го-го-го, каза. Словы народныя, апрацоўка Л. Сімаковіч . . . 32
Вясна. Верш Я. Коласа, музыка М. Літвіна . . . 35
Ды пойдзем, сястрыцы. Беларуская народная песня для мяшанага хору і ф-на. Апрацоўна С. Янковіча . . . 38
Край мой. Песня для голасу і мяшанага 3-галосңага хору ў суправаджэнні фартэпіяна. Верш С. Панізніка, музыка В. Войціка . . . 46
Мой родны кут. Верш Я. Коласа, музыка І. Лучанка, пераклад для жаночага хору М. Корсака . . . 49
Спадчына. Верш Я. Коласа, музыка І. Лучанка . . . 57


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РОДНАЯ СТАРОНКА

Рэпертуарны зборнік
для акадэмічных харавых калектываў

Укладальнік **В. Новік**
Музычны рэдактар **І. Вінаградава**
Рэдактар **Л. Савіцкая**

Падпісана ў друк 28.12.88 г. Фармат $60 \times 84^1/_8$. Папера афсетная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 3,72. Ул.-выд. арк. 7,0. Тыраж 1000 экз. Зак. 5857. Цана 1 руб.

Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр культуры. 220600 г. Мінск, вул. А. Пашкевіч, 3.

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа. 220079 г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.